*Ларыса Гаўрына*

# ПЕСЕННЫ ФАЛЬКЛОР ЯК АСНОВА ДУХОЎНАГА РАЗВІЦЦЯ МОЛАДЗІ

Чаму трэба ведаць народныя песні? Навошта іх вывучаць? Адказ на гэтае пытанне вынікае з таго значэння, якое маюць народныя песні і наогул фальклор для духоўнага жыцця нацыі сёння. Народныя песні - толькі частка ад ўсёй вусна-паэтычнай творчасці народа, але тая частка, якая мае самы кароткі шлях да сэрда мільёнаў, бо найбольш непасрэдна і моцна ўздзейнічае на пачуцці людзей. Гэтым прадвызначана асобая роля і значэнне песеннага фальклору ў параўнанні з іншымі відамі народна-паэтычнай творчасці.

Народныя песні маюць, па-першае, вельмі вялікае пазнавальнае значэнне. Узнікшы ў глыбокай старажытнасці, у часы яшчэ дагістарычныя, песні суправаджалі жыццё працоўнага чалавека праз стагоддзі, адбіваючы ў паэтычных вобразах і малюнках яго сацыяльнае становішча, яго побыт, мараль і светапогляд на кожным этапе гістарычнага развіцця грамадства. Усе найважнейшыя падзеі, перамены і зрухі ў жыцці народа - якога б характару яны ні былі - эканамічнага, ваеннага, нацыянальнага, рэлігійнага - знайшлі сваё больш або менш поўнае адлюстраванне ў песнях. У гэтым сэнсе песенная творчасць народа сапраўды з'яўляецца своеасаблівым летапісам яго жыцця і барацьбы, яго няспыннага імкнення да свабоды і шчасця.

Але не толькі на падзеі гістарычнага значэння адклікалася песня. Яна падавала свой голас і ў штодзённым побыце чалавека працы з выпадку якой-небудзь гаспадарчай ці сямейнай радасці, або наадварот - калі здаралася няшчасце, гора, і ў залежнасці ад гэтага - або весялілася адкрыта і непрытворна, або горка і няўцешна плакала, роспачна і гнеўна праклінала. Я на расказвала пра ўсё, чым жыў чалавек. што яго мучыла і гняло, абнадзейвала і хвалявала; і пра тое, што было агульным, бо аднолькава датычыла многіх, і пра тое, што было яго асабістым, бо таілася ў самых інтымных куточках ягонай душы.

Выдатны знаўца беларускіх народных песень народны артыст СССР Р.Р.Шырма пісаў: «Шмат мудрасці, трывогі і радасці, святла і горычы, шчырай любві і праўды захавала ў сваіх скарбах беларуская народная песня. Яна зарадзілася ў далёкія часы гісторыі народа, разам з ім расла і развівалася, пераказваючы мастацкімі вобразамі долю і нядолю многіх пакаленняў, адлюстроўваючы доўгі гістарычны шлях».

Па-другое, народныя песні, як і ўся народная паэзія наогул, з'яўляюцца выключна важным сродкам патрыятычнага, сацыяльнага, этычнага і эстэтычнага выхавання моладзі. Лепшыя прадстаўнікі любой нацыянальнай культуры гэта разумелі заўсёды, але не заўсёды, на жаль, усведамлялі гэта належным чынам тыя, каму ў першую чаргу давяраецца выхаванне новых па-каленняў. Больш чым стагоддзе з чвэрцю таму назад В.Р.Бялінскі пісаў: «Вельмі карысна, і нават неабходна, знаёміць дзяцей з рускімі народнымі песнямі... Народнасць звычайна выпускаецца ў нас з плана выхавання: часта не толькі юнакі, але і дзеці ведаюць на памяць урыўкі з трагедыі Карнеля і Расіна і ўмеюць пераказаць дзесятак анекдотаў пра Генрыха IV, пра Людовіка XIV, а між тым не маюць і ўяўлення аб скарбах сваёй народнай паэзіі... Давайце дзецям больш і больш сузірання агульнага, чалавечага, сусветнага; але пераважна старайцеся знаёміць іх з гэтым праз родныя і нацыянальныя з'явы... Агульнае выяўляецца толькі ў прыватным: хто не належыць сваёй бацькаўшчыне, той не належыць і чалавецтву».

Народная песня - адно з мацнейшых проціяддзяў ад рознай небяспечнай пошасці ідэйнага, маральнага і эстэтычнага парадку, адзін з лепшых сродкаў у барацьбе за духоўнае здароўе моладзі. Калі мы хочам, каб новыя пакаленні выраcталі разумнымі і сур'ёзнымі гаспадарамі свайго лёсу, зямлі і краіны, каб яны не былі верхаглядамі і крыўлякамі, каб яны не адрываліся ад здаровай народнай асновы - глебы жыцця і прагрэсу, каб яны былі ўзброены сапраўды народным поглядам на жыццё, на правы і абавязкі чалавека, - трэба прывіваць моладзі любоў да народнай паэтычнай творчасці, да народных песень.

Калі дзеці з малых гадоў, з першых класаў школы будуць добра ведаць паэтычную творчасць народа - у іх выпрацуецца на ўсё жыццё сапраўдная народная свядомасць, і значна цяжэй будзе пранікнуць у іх галовы чужому, наноснаму, шкоднаму. «Нішто не зможа так ускалыхнуць пачуцці патрыятызму, як родная песня», - пісаў у адным з артыкулаў Р. Р. Шырма.

У народзе ніколі спецыяльна не гаварылася і не патрабавалася ад моладзі: маўляў, вывучайце матчыны песні, любіце і беражыце іх. Гэта разумелася само сабой: песні ад калыскі перадаваліся дзецям, успрымаліся і пераймаліся, як і ўсякі іншы вопыт старэйшых. Маладыя проста чулі душой - гэта трэба, без гэтага ты будзеш як бы несапраўдны чалавек на зямлі, не такі, як усе добрыя людзі. Усведамленне неабходнасці вывучадь і ведаць родныя песні прыходзіла натуральна: песні акружалі дзіця з малых гадоў і ўваходзілі ў яго жыццё, у яго душу гэтак жа, як і многія іншыя духоўныя набыткі бацькоў. Спецыяльна ж аб адносінах да паэтычнай творчасдi народа пачыналі гаварыць тады і там, калі і дзе гэтыя адносіны набывалі непажаданы характар, пераставалі адпавядаць задачам духоўнага развіцця грамадства.

Увогуле праблема адносін да фальклору, да мастацкіх скарбаў народа - адна з няпростых у нашы дні. Было б неразумна і недаравальна закрываць вочы на тое, што сярод пэўнай часткі сучаснай моладзі распаўсюджана нігілістычнае стаўленне да паэтычнай спадчыны мінулых - далёкіх і не так далёкіх - часоў. На гэта, вядома, ёсць свае прычыны. Мы жывём у эпоху грандыёзнай рэвалюцыйнай ломкі, агромністых перамен і пераўтварэнняў, у век небывалага тэхнічнага прагрэсу, век атаму і космасу. У запале гэтай барацьбы («Даеш новае!») да шкодных перажыткаў мінулага асобнымі культ- і асветработнікамі былі аднесены і некаторыя. хаця і даўнія, але здаровыя і каштоўныя народныя традыцыі, звычаі, абрады - а заадно і песні. Думаецца, што гэта нанесла пэўную шкоду ідэйна-эстэтычнаму выхаванню моладзі.

«Вялікая бяда! - іранічна ўсклікнуць іншыя. - Не ведаюдь дзеці народных песень? Ну і што? Хіба без іх нельга быць сапраўдным чалавекам? Хіба не вядомы прыклады?» Можна, зразумела, быць каштоўным для грамадства чалавекам і не ведаючы народных песень. Але хіба не ясна другое - што можна мець у грамадстве куды больш сапраўдных людзей, калі засцерагчы моладзь ад шкодных спакус і крывых шляхоў, калі даць ім сапраўды народнае выхаванне. Апошняе ж

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

немагчыма без выкарыстання духоўных скарбаў фальклору. Апрача таго: хіба не ясна, наколькі збядняе свой духоўны свет і якой велізарнай чалавечай радасці пазбаўляе сябе той. хто адварочваецца ад фальклору?

Само сабой зразумела, што вывучэнне народных песень сёння зусім не азначае, што трэба прывіваць моладзі ўстарэлыя, архаічныя густы і погляды на жыццё, характэрныя для многіх даўнейшых песень. Трэба браць з фальклору тое, што не страціла сваіх ідэйна-эстэтычных вартасцей, што можа быць паспяхова выкарыстана для выхавання. А такога матэрыялу ў песенным фальклоры нашага народа вельмі і вельмі многа. Вазьміце, напрыклад, народныя песні пра каханне, пра любоў і павагу да бацькоў і да родных-блізкіх, да працы, да свайго бацькоўскага краю. Якія б змены ў жыцці ні адбываліся, людзі не перастаюць заставацца людзьмі, цаніць чалавечнасць і прыгажосць узаемаадносін, у тым ліку - чысціню пачуцця кахання. А песні якраз і дапамогуць развіваць і выхаваць такія пачуцці і такія ўзаемаадносіны.

Часам кажуць: старыя песні - тужлівыя і сумныя, у іх многа жалю, смутку і горычы. Што ж, вядома, шмат і такіх песень. Але, па-першае, вельмі многа маецца песень і іншай танальнасці - жыццярадаснай і вясёлай. А па-другое, мы хочам бачыць нашага маладога сучасніка гарманічна развітага, духоўна багатага, надзеленага ўсёй магчымай гамай чалавечых пачуццяў (у тым ліку - смутку, горычы, спачування). Не магу ўспомніць кім, але вельмі правільна было сказана, што тужлівасць народнай песні - больш здаровы харч, чым модная дзе-нідзе дрэнная эстраднасць з яе лёгкасцю, якая дэмабілізуе душу чапавека.

І так, трэба распальваць у масах, і перш за ўсё - у маладым пакаленні, цікавасць і павагу да песеннага фальклору. Не дай бог, калі ў народзе заглохне і адамрэ цікавасць да сваей уласнай паэтычнай творчасці. Дзесяткі выдатных людзей аддалі доўгія гады свайго жыцця справе збірання, даследавання і папулярызацыі родных песень. Прыгадаем такія, вартыя най-глыбейшай нашай павагі, імёны, як Ян Чачот і Іван Насовіч, Еўдакім Раманаў і Мікалай Нікіфароўскі, Павел Шэйн і Уладзімір Дабравольскі, Мікалай Янчук і Мітрафан Доўнар-Запольскі, Міхаіл Федароўскі і Яўхім Карскі, Антон Грыневіч і Уладхіхір Тэрраўскі, Мікалай Чуркін і Сяргей Сахараў. А колькі зрабілі у гэтым кірунку нашы сучаснікі Рыгор Раманавіч Шырма і Генадзь Іванавіч Цітовіч, З.Мажэйка, Т.Варфаламеева і іншыя фалькларысты. Многа разоў даводзілася мне слухаць родныя песні ў выкананні Нацыянальнага акадэмічнага ароднагахору Беларусі імя Г.Цітовіча. І кожны раз радасна бачыць, як узрушана ажыўлялася і замірала зала, як хораша - праўдзівым чалавечым святлом - свяціліся ў зале вочы, з якой невыказнай удзячнасцю раскрываліся людскія сэрцы, і думалася тады: якое гэта шчасце, што можна вось так, забыўшыся на ўсе клопаты і згрызоты, далучыцца душою да гэтага дзівоснага хараства, прыгубіць з гэтай чароўнай жывой крыніцы! Як добра і радасна жыць, ведаючы, што ёсць такі цуд на свеце - беларуская народная песня, і ёсць такі чарадзей, які гукамі гэтай песні робіць з тваім сэрцам нешта такое, што і слоў няма, каб сказаць, а толькі слёзы сыплюцца!.. І колькі іх, што выйдуць усхваляванымі з залы, і панясуць з сабою ў жыццё прамяністую радасць гэтай сустрэчы, і ўжо будуць глядзець на свет трошкі не так, як глядзелі дагэтуль, і будуць думаць пра сваё чалавечае прызначэнне з большай яснасцю, чым думалі ўчора, бо заставацца тым самым пасля такога духоўнага ачышчэння немагчыма: сапраўднае мастацтва не адпускае ад сябе чалавека без свайго магічнага і шчодрага надарунка. І пойдзе тэты ўдзячны чапавек, і скрозь і ўсюды - за станком і за плугам, у лабараторыі і за мальбертам - яго не будзе пакідаць гордае ўсведамленне, што ён належыць да народа, імя якога трэба несці высока, як сцяг. І будзе гучаць у яго сэрцы, як самае чыстае і высакароднае парыванне, неўміручая народная мелодыя:

«Люблю наш край старонку гэту, Дзе я радзілася, расла, Дзе першы раз пазнала шчасце, Слязу нядолі праліла»

І песню родную люблю я, Што ў полі жнеі запяюць, Як гукі звонкія над нівай Пераліваюцца, плывуць..»

Незлічонае мноства песень захавала і зберагла людская памяць, перадаючы іх з пакалення ў пакаленне як неацэнную спадчыну і запавет нашчадкам. Тысячы іх запісаны і апублікаваны ў розных зборніках і перыя-дычных выданнях, а тысячы яшчэ і сёння ходзяць у народзе непрыгледжанымі, у чаканні, калі іх апытае клапатлівы збіральнік. Буду шчаслівa калі абудзіцца ў нейчай душы жаданне далучыцца да вялікай і ганаровай патрыятычнай справы - збірання, захавання і папулярызацыі песенных скарбаў народа. Нашы песенныя скарбы - гэта не проста спадчына мінулага, і тым больш не мёртвы капітал, якім можна толькі люба-вацца, але не скарыстоўваць. Народныя песні, у тым ліку і многія даўнія традыцыйныя, не трацяць сваёй жыццяздольнасці і сёння, актыўна і арганічна ўваходзяць у паўсядзённы побыт народа, задавальняючы яго духоўныя запатрабаванні, спрыяючы ідэйнаму і эстэтычнаму выхаванню мае.

Няма ніякага сумнення, што народная песня - і традыцыйная і новая - павінна займаць паважнае месца ў праграмах навучання. Ролю народна-песенных скарбаў У выхаваўчым працэсе ў вузе цяжка пераацаніць. Валодаючы вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння, народная песня з'яўляецца адным з выдатных сродкаў сацыяльна-класавага, патрыятычнага і эстэтычнага выхавання моладзі. Раскрытая ў яркіх паэтычных вобразах гісторыя жыцця і барацьбы працоўных здольна глыбока запасці ў душу і сэрца маладога чалавека і абудзіць, ускалыхнуць у ім пачуцці патрыятызму, любві і замілавання да роднага краю, сыноўняй гордасці за гераічнае мінулае і сучаснае свайго народа, за яго вялікасныя здзяйсненні на шляху будаўніцтва. Жывое паэтычнае слова, спалучанае з цудоўнай мелодыяй, здольна раскрыць для моладзі хараство і багацце народнай душы, недасягальную вышыню, сілу і моц народнага духу, дапаможа акрыліць іх веру ў вялікую будучыню свайго народа, у яго шчаслівае заўтра.

Правераная і выпрабаваная часам, адшліфаваная ў сэрцах і ў вуснах тысяч безыменных майстроў, беларуская народная песня і сёння хораша служыць і будзе служыць людзям добрай волі ў іх імкненні да міру і шчасця на зямлі. Наш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клопат і наш абавязак - каб яна і надалей развінапа сває крыллі шырока над светам, каб яна несла ў свет высакародныя, прышжыя і гуманныя думы, пачуцці і мары тапенавітага, прадавітага, гераічнага народа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ